Адзел адукацыі, спорту і турызму Лідскага райвыканкама
Дзяржаўная установа адукацыі “Сярэдняя школа № 1 г. Ліды”

# Легенды і паданні Ліды і Лідскага раёна

НАМІНАЦЫЯ
*«Праектна-даследчая дзейнасць з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій»*

**Кіраўнік праекта:** Сурконт Таццяна Мар’янаўна,
настаўніца гісторыі

Ліда
2014

| Назва праекта | Легенды і паданні Ліды і Лідскага раёна |
|---|---|
| Намінацыя праекта | Праектна-даследчая дзейнасць з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій |
| Установа адукацыі | Дзяржаўная ўстанова адукацыі<br>“Сярэдняя школа №1 г. Ліды” |
| Звесткі аб аўтарах | **Збор і сістэматызацыя матэрыяла:**<br>члены клуба "Грамадзянін" СШ №1 г.Ліды.<br>**Дызайн і распрацоўка сайта:**<br>Сазанавец Ігар, вучань 11 “А” класа,<br>Круглы Павел Францавіч, настаўнік інфарматыкі.<br>**Кіраўнік і каардынатар праекта:**<br>Сурконт Таццяна Мар’янаўна, настаўніца гісторыі. |
| Тэхнічныя патрабаванні | **Мінімальныя патрабаванні:**<br>• Pentium 2000 Мгц;<br>• Аудыякарта;<br>• Браўзэр Internet Explorer 7 (дазволіць заблакіраваны змест);<br>• Adobe Flash Player.<br>**Рэкамендацыйныя патрабаванні:**<br>• Pentium 3000 Мгц і вышэй;<br>• Аудыякарта;<br>• Браўзэр Opera 12;<br>• Adobe Flash Player. |
| Дзеючая ссылка праекта ў сетцы Інтэрнэт | Размешчана на сайце СШ № 1 г.Ліды ў раздзеле Музей (http://lida-sch1.ehost.by/index.php)<br>Поўная ссылка:<br>http://lida-sch1.ehost.by/index.php?option=com_content&view=article&id=445&Itemid=539 |
| Апісанне праекта | **Актуальнасць.** Сярод жанраў вусна-паэтычнай прозы значнае месца ў беларускім фальклоры займаюць легенды і паданні. На жаль, яны незаслужана засталіся без увагі навукоўцаў і краязнаўцаў беларускай народнай творчасці і на сучасным этапе пастулова пераходзяць у пасіўны стан, калі спыняецца пераемнасць: тэксты яшчэ помняць, але не перадаюць.<br>Праект накіраваны на тое, каб садзейнічаць захаванню і далейшай трансляцыі легенд і паданняў Лідскай зямлі.<br>Тэма даследавання з’яўляецца актуальнай таму, што яна спрыяе пашырэнню цікавасці да культуры і гісторыі свайго края. Мастацкія вобразы легенд і паданняў дапамагаюць зразумець характар, каштоўнасці, асаблівасці побыту нашых продкаў, а таксама нясуць пэўную гістарычную інфармацыю аб роднай зямлі.<br>**Мэта пректа:** папулярызацыя самабытнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны (легендаў і паданняў) лідскай зямлі. |

| | |
|---|---|
| | **Навізна і інавацыйнасць. ПРАЕКТ – гэта:**<br>• Першая спроба збора легенд і паданняў Лідскай зямлі.<br>• Аўтарскі варыянт класіфікацыі тыпаў беларускіх легенд і паданняў і іх сістэматызацыя.<br>• Першы беларускамоўны сайт дадзенай накіраванасці.<br>• Арыентацыя на шырокія колы грамадства – усіх тых, хто цікавіцца мінулым.<br>• Поле для пошуку народных твораў сівой даўніны, для ўдасканалення даследчых і творчых навыкаў.<br>**Змест праекта.** Праект выкананы ў выглядзе вэб-сайта.<br>**Галоўная старонка –** агульныя звесткі аб легендах і паданнях.<br>**Легенды і паданні горада Ліды –** змешчаны 26 легендаў і паданняў прысвечаных гораду.<br>**Легенды і паданні Лідскага раёна –** змешчаны 43 легенды і паданні, распаўсюджаныя на тэрыторыі раёна.<br>**Даследчая дзейнасць –** прапанаваны анкета-апытальнік “Ці ведаеце вы легенды і паданні?” і вынікі анкетавання вучняў; прадстаўлены відэафрагмент “Сацыялагічнае апытанне на вуліцах горада”; змешчаны даследчая праца “Таямніцы лідскай зямлі”, тэзісы да яе і матэрыял да абароны працы; прапанаваны прэзентацыйны матэрыял сацыяльнага праекта “Таямніцы лідскай зямлі”.<br>**Зборнік “Таямніцы лідскай зямлі”** – змешчаны змест 69 легендаў і паданняў.<br>**Творчая майстэрня** – прапанаваны тры паштоўкі і каляндар з легендамі і паданнямі Лідчыны, якія можна спампаваць і распячатаць.<br>**Зваротная сувязь.**<br>На сайце змешчана больш за 40 фотаздымкаў, зробленых падчас экспедыцый, анімацыя, слайд-шоў, 5 відэасюжэтаў. Прычым адзін з іх “Сядзіба в. Тарнова: шлях з мінулага ў будучыню” створаны вучнямі школы і змяшчае не толькі легенду аб фамільнай ўсыпальніцы Маўрасаў, а ўвогулле распавядае аб гісторыі сядзібы і нават аб перспектывах на будучае.<br>Ажывіць вобразы герояў легенд і паданняў дазваляюць больш за 25 аўтарскіх малюнкаў вучняў школы. |
| Вынікі практычнага выкарыстання праекта | Матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца на ўроках “Мая Радзіма Беларусь” у пачатковай школе, на ўроках беларускай літаратуры ў 5-х класах пры вывучэнні тэмы "Мой родны кут у легендах і паданнях", пры правядзенні заняткаў гуртка "Адраджэнне", а таксама на класных і інфармацыйных гадзінах і пазакласных мерапрыемствах. Сабраныя матэрыялы могуць стаць базай для арганізацыі даследчай дзейнаці па беларускай філалогіі.<br>Увогулле вынікі даследавання могуць быць карыснымі ў вывучэнні гісторыі роднага краю, а таксама садзейнічаць |

| | |
|---|---|
| | пашырэнню турыстычнай прывабнасці рэгіёну, што асабліва актуальна ў год гасціннасці. |
| Маштабнасць праекта | У праекце прынялі ўдзел амаль усе вучні СШ №1 г. Ліды і іх бацькі, настаўнікі. Былі арганізаваны краязнаўчыя экспедыцыі па Лідскім раёне, сустрэчы з цікавымі людзьмі, кансультацыі з работнікамі бібліятэк горада і раёна, супрацоўнікамі гісторыка-краязнаўчага музея, супрацоўнікамі турыстычнага агенства “Святавіт”.<br>Праведзены шматлікія пазакласныя мерапрыемствы – конкурс малюнкаў, конкурс на лепшую інсцэніроўку легенд, арганізавана праца лектарскіх груп і іншыя. |
| Заключэнне | Праект спрыяе захаванню для нашчадкаў адной з самых цікавых галін вуснай народнай творчасці беларусаў.<br>Ён арыентаваны ў большай ступені не на даследчыкаў, якія займаюцца фальклорнай спадчынай, а на шырокія колы грамадства.<br>Па аналогіі можна стварыць падобныя праекты па асобных населеных пунктах, а потым іх аб’яднаць у грунтойны праект “Беларусь у легендах і паданнях”.<br>Упэўнены, што трэба ведаць, шанаваць і скарыстоўваць не толькі матэрыяльныя помнікі гісторыі і культуры, але і духоўныя здабыткі, легенды і паданні свайго народа. |